Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№211 (28575)

1 ЛІСТАПАДА 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ стар. 9–16



**Агляд беларускага тыдня моды**

СТАР. 4



**Новыя вакансіі і новыя магчымасці** МС



**Адчуць сябе гаспадаром двара** МС

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір ПАТУПЧЫК, міністр энергетыкі:**

*«Нам вельмі важна збалансаваць дзейнасць нашых энерга- і газазабеспячальных арганізацый. З аднаго боку, трэба забяспечыць прымальныя тарыфы для насельніцтва, з другога — канкурэнтаздольныя тарыфы для эканомікі ва ўмовах перакрыжаванага субсідавання і сённяшніх цэн на газ. Мы павінны паслядоўна рухацца па шляху зніжэння тарыфаў для рэальнага сектара эканомікі, і гэты працэс не будзе спыняцца ні ў 2018-м, ні ў 2019-м».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.11.2017 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 1,9741 ▲ |
| Еўра | 2,2970 ▲ |
| Рас. руб. | 0,0339 ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0734 ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА



Уладзімір СОЙМІН — тэхнік-тэхнолаг і майстар вытворчага навучання Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта (БНТУ) — трэці год вучыць студэнтаў (па сутнасці, сваіх равеснікаў) — будучых інжынераў-тэхнолагаў майстэрству зваршчыка. На гэтым здымку малады майстар выкладае азы розных відаў механічнай зваркі студэнтам-першакурснікам дзённага аддзялення механіка-тэхнічнага факультэта ўніверсітэта. Сам Уладзімір — студэнт-завочнік гэтага ж факультэта. Пасля размеркавання ў каледжы ён прыйшоў сюды на працу, але вырашыў адначасова працягваць вучобу. Цяпер ён — самы малады спецыяліст сярод майстроў вытворчага навучання.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

■ Ва ўрадзе

## Паспеем за прамысловай рэвалюцыяй

**Праект стратэгіі развіцця навукі і тэхналогій на 2018—2040 гады, а таксама выкарыстанне сродкаў інавацыйных фондаў абмеркавалі на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў. Як адзначыў прэм'ер-міністр Андрэй КАБЯКОЎ, распрацоўка стратэгіі стане адным з ключавых мерапрыемстваў Года навукі. Паводле задумкі Нацыянальнай акадэміі навук, стратэгія павінна стаць дакументам, які вызначае асноўныя прыярытэты навукова-тэхналагічнага развіцця краіны на доўгатэрміновую перспектыву.**

«Таму папрашу ўсіх ставіцца да яго ўважліва. Гэта не нейкая абстракцыя або вельмі аддаленая перспектыва. Гэтае пытанне сверхактуальнае», — падкрэсліў Андрэй Кабякоў.

Па словах **старшыні Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Уладзіміра ГУСАКОВА,** пры падрыхтоўцы праекта дакумента стратэгіі НАН выкарыстала найлепшы сусветны вопыт. «Навука развіваецца хуткімі тэмпамі, з'яўляюцца новыя распрацоўкі ў IT-сферы, галінах штучнага інтэлекту, робататэхнікі. Наша краіна не павінна адставаць у гэтым кірунку. У нас ёсць добры патэнцыял, высокакваліфікаваныя кадры для развіцця навукі», — лічыць Уладзімір Гусакоў.

СТАР. 2

## ЧЫТАЙ «ЗВЯЗДУ» — ПРАЧЫТАЕШ УСЁ

**Не сакрэт, што звяздоўцы любяць сваіх чытачоў, людзей адметных, цікавых і шчырых. А колькі захапляльных гісторый ды тэм яны падказваюць нам, карэспандэнтам... Аддзячыць нашым шаноўным падпісчыкам і заўзятарам мы можам добрым словам ды падарункамі. У рэкламнай гульні сярод падпісчыкаў на "Звязду" на чацвёрты квартал мы разыгралі шэсць электрычных вяндлярняў. Адну з іх нашы карэспандэнты самі павезлі на Гродзеншчыну.**



У Гродзенскай вобласці гэты патрэбны ў гаспадарцы апарат выйграла **Ірына КРОТАВА, галоўны бухгалтар ДРБУ №158, філіяла КУП «Гроднааблдарбуд» з Карэліч.** Такім чынам, на выхадных у нашай падпісчыцы з больш як 25-гадовым стажам атрымалася двайное свята: уручэнне прыза ад «Звязды» і Дзень дарожніка і аўтамабіліста. Якраз перад нашай сустрэчай Ірыне Іванаўне ўручылі на прадпрыемстве грамату і прэмію.

— Яшчэ падчас першага розыгрышу — больш за 25 гадоў таму назад, я тады выпісвала газету яшчэ толькі два гады — я выйграла ў «Звяздзе» фотаапарат «Зеніт». Ён і дагэтуль у нас ёсць і спраўны. Шмат ім здымалі. Шкада, што зараз плёнку да яго цяжка знайсці, — расказвае жанчына.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА *Да чытача з любоўю!*

**ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ КАШТОЎНЫЯ ПРЫЗЫ!**

**Пачалася падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2018 года!**

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!